Год II — Аўторак, 14 лютага 1922 г. — № 30

РАНІЦА

штодзенная грамадзкая, палітычная і літэратурная газэта

АДРЭС РЭДАКЦЫІ і КАНТОРЫ: Вільня, Афярная № 4, кв. 2.
Рэдакцыя адчынена што дня, апрача сьвят, ад 11 да 1. Адміністрацыя—ад 10 да 3.

Цана нумару 20 марак.
Падпіска на 1 мес. . . 400 марак.
З перасылкай на 1 „ . . 500 „
За граніцу ў два разы даражэй.

ЦАНА АБВЕСТАК:
За адзін радок звычайнага друку на 1 стр.—60 м.
ў тэксьце . . . . 75 м.
за тэкстам . . . . 40 м.
Для шукаючых працы на 10 проц. таней.

Вільня, 14 лютага 1922 г.

Пад гоман Віленскага Сойму, які вырашае справу далейшае будучыну Віленшчыны, неяк, ні грамадзянства наша, ні прэса не зьвярнула патрэбнай увагі на ня меней важнае пытаньне, якое ў хуткім часе выплыве на пленум Варшаўскага Сойму і знаходзіцца цяперака на разглядзе Школьнай Соймавой камісіі, — справа школьнай прасьветы.

Беларускае сялянства моцнымі групамі раскінутае на абшарах усходняй граніцы Польшчы, вельмі зацікаўлена ў развязцы гэтага пытаньня, згодна са сваімі нацыянальнымі інтарэсамі, і тое ці іншае вырашэньне яго будзе мець рашучае значэньне на будучыну нашага нацыянальнага жыцьця і тых ці іншых адносін да Польшчы.

З тых вестак, якія тым часам падала варшаўская прэса відаць, што справу народнай прасьветы Варшаўскі Сойм надумаў паставіць шырока, не гледзячы на фінасавыя клопаты—прадстаўнік Міністэрства фінансаў абяцаў знайсьці патрэбныя сумы на тыя выдаткі, якія шчодрай рукою хоча на справу асьветы асыгнаваць Варшаўскі Сойм, і гэта ёсьць найлепшай гарантыяй таго, што, як і трэба было спадзявацца, справа народнай прасьветы ў Польшчы зрушыцца з мейсца і ў хуткім часе прынясе зусім рэальныя рэзультаты.

Але нас цікавіць спэцыяльна мейсца аб школах народных меньшасьцяў Польшчы. Камісія народнай прасьветы Варшаўскага Сойму адкінула папраўку правых групаў Сойму, патрабуючых, каб навучаньне ў школах народных меншасьцяў вялося ў польскай мове. Маем надзею, што на пленуме Сойму, гэтая папраўка, так сама ня знойдзе большасьці: значыць школы народных меншасьцяў, будуць мець родную выкладовую мову, што з'яўляецца зусім зразумелым, бо штож-бы гэта была за „школа нацыянальнай меншасьці“ калі-б навука мела вясьціся ў польскай мове?

Тое, што гэная папраўка адкінута, мы ня можам прызнаць за нейкую здабычу. Само істнаваньне гэнага пытаньня паказвае, што справа школы нацыянальных меншасьцяў спатыкае ў самой аснове сваей перашкоды і паступовыя гурткі польскага грамадзянства не адзін раз волю сваю змушаны будуць праціставіць вузка нацыяналістычным тэндэнцыям польскай рэакцыі, пакуль даб'юцца вырашэньня справы аб школах народных меншасьцяў, згодна з добра зразумелымі інтарэсамі польскага народу і тых няпольскіх нацыянальных групаў, якія, стоячы на грунце Польскай Дзяржаўнасьці, ня могуць адрачыся ад сваіх нацыянальных ідэалаў.

Дзеля гэтага Беларускі народ пільна прыслухваецца голасу Варшаўскага Сойму, пастанова якога ў справе беларускай школы моцна заважыць на будучыне яго нацыянальнага жыцьця.

ТЭЛЕГРАМЫ.

ВАРШАВА 11. II. (А. У.) „Kurjer Poranny“ паведамляе, што адстаўка міністра публічных работ Нарушовіча ня будзе прынята.

ВАРШАВА 11. II. (А. У.) Для вядзеньня перагавораў у справе гандлёвага трактату паміж Польшчай і Савецкай Расеяй, якая вызначыла з свайго боку charge d'aferies Украіны Шумскага і прадстаўніка „внешторга“ Гарчакава. Перагаворы скора пачнуцца.

ВАРШАВА 11. II. (А. У.) „Kurjer Warszawski“ паведамляе, што ў соймавых кулуарах ходзяць пагалоскі, што яшчэ перад прыездам дэлегацыі Віленскага Сойму наступіць паразуменьне паміж Варшаўскім Урадам і Соймам у адносінах да Віленскай справы.

ПАРЫЖ 11. II. (А. У.) Тут памёр вядомы актор францускай камэдыі Поль Монэ.

РЫМ 11. II. (А. У.) У італьянскіх і швайцарскіх дыплёматычных колах пануе пракананьне, што Гэнуэская конфэрэнцыя будзе адложана на колькі тыдняў, з прычыны занятага францыяй стаўвішча.

РЫМ 11. II. Адстаўка кабінэту Баномі яшчэ аканьчальна ня прынята каралём.

ВАШЫГТОН 11. II. (А. У.) Палітычныя колы ўважаюць спэцыяльны нациск Лёйд-Джорджа аб адкрыцьці Гэнуэскай конфэрэнцыі 8 сакавіка, як яго асабістую справу ў палітычных колах уважаюць, што прынцыпова няма ніякіх затрудненьняў, каб. згодна з пажаданьнямі Францыі, адлажыць тэрмін адкрыцьця конфэрэнцыі.

АДЭСА 13. 2. (А. У.) Губэрскі Соўнарком выдаў пастанову аб дэнацыяналізацыі ўсіх дробных прадпрыемстваў, якія ў свой час не залічыны да прадпрыемстваў падлягаючых Усерасэйскаму Гаспадарчаму Савету, і пастанавіў зьвярнуць іх папярэднім уласьнікам.

АДЭСА 13. 2. (А. У.) Рэвалюцыйны трыбунал ў Стаўропалі прыгаварыў к расстрэлу некалькі жаўпераў, супрацоўнікаў чрэзвычайкі за спэкулятыўную афэру з 20 каратавым брыльлянтам.

ХАРКАЎ 13. 2. (А. У.) З Мікалаеўскай губ. паведамляюць, што ўсё часьцей здараюцца напады на ўрадавыя магазыны збожжа. Савецкая прэса прыпісвае гэтыя напады правакатарам. Сапраўднай-жа прычынай гэтых нападаў— з'яўляецца голад, які ўзрастае з каждым днём.

БЭРЛІН 13. 2. (А. У.) Кабінэтны крызіс абастраецца ўсё болей. Вялікую ўвагу парлямэнцкіх колаў зьвярнула суботняя дэклярацыя канцлера, які дамагаецца афіцыяльнага вотума даверыя, „Berliner Zeitung“ лічыць сытуацыю надта цяжкай.

БЭРЛІН 13. 2. (А. У.) Бюро паміжнароднага профэсыянальнага саюзу пастанавіло адбыць, адначасна з Гэнуэскай конфэрэнцыяй, нараду, якая будзе разважаць справу аб дапушчэньні прадстаўнікоў рабочых на конфэрэнцыю ў Гэнуі.

БЭРЛІН 13. 2. (А. У.) „Vorwarts“ паведамляе, што ў Нямеччыне, ня гледзячы на заверэньня канцлера, распачата сьледства проціў жалезнадарожных служашчых.

БЭРЛІН 13.2 (А. У.) Тутэйшая прэса паведамляе, што трэба ў блізкім часе спадзявацца прыезду ў Бэрлін паміжсаюзнай камісіі адшкадаваньня якая мае мэтай ўстанавіць размер нямецкіх выплатаў за гэты год.

Рашучы момант.

(Размова карэспандэнта (W. A. P.) з панам Маршалкам Сойму Лакуцыеўскім).

Уся Віленшчына з няцярплівасьцю чакае апошніх вынікаў нарадаў Віленскаму Сойму. Частка грамадзянства, якая разбіраецца ў адносінах, добра разумее, што тое вырашэньне, якое Сойм, нарэшце, прыме, ня можа быць зроблена адразу, бо яно павінна прайсьці ўсялякія пробы, пакуль стане магчымым да прыняцьця ўсімі соймавымі групамі, ці хоць рашучаю большасьцю. У каждым разе, шырокія колы грамадзянства ўжо не цярпліваецца і, ўсё часьцей, пытаюць, чаму яны так доўга радзяцца? З гэтай прычыны я рашыў пайсьці да пана Маршалка Лакуцыеўскага, каб з першай крыніцы аб усім даведацца.

Па дакладзе п. Уладыслава Камінскага, сэкратара п. Маршалка, я праз дзьве мінуты быў запрошаны ў габінэт Маршалка. Абменяўшыся з ім некалькімі ўступнымі фразамі, я проста запытаў:

— Якія-ж, п. Маршалак, ёсьць надзеі ў зьвязку з нарадамі камісій, на конт хуткага заканчэньня Соймавых працаў?

— Бачыце, пане, камісіі мандатная і па апрацаваньню наказу, бадай ўжо скончылі сваю працу, а тое, чаго яны яшчэ ня зрабілі, ня будзе мець надта рашучага ўплыву на хуткасьць Соймавых працаў. Найважнейшым пытаньнем ёсьць добрае заканчэньне нарадаў палітычнай камісіі. Вось цяперашнія дні і ёсьць, у гэтым сэнсе, рашучымі. Увесь час ідуць нарады. У гэты момант ужо можна сказаць, што аб справе прынцыповай часткі формулы вырашэньня Сойму, можна судзіць наперад, ў тым сэнсе, што Сойм выскажацца за прылучэньне (wcielenie) Віленшчыны да Польшчы; цяпер можа йсьці толькі мова аб спосабах выпаўненьня. У гэтай справе могуць быць такія магчымасьці: Сойм зьвернецца да Польскага Ураду з просьбаю назначыць гэнэральнага дэлегата, які прыняў-бы ўладу ў Віленшчыне, і вышле ў Варшаву дэлегацыю, якая напэўна войдзе ў склад Уставадаўчага Сойму Рэчыпаспалітай.

— Якое агульнае ўражэньне зрабіў ў соймавых клюбах вываз за граніцу Віленшчыны арыштаваных беларускіх і літоўскіх дзеячоў?

— Справа гэтая зрабіла ў клюбах вялікае рушэньне. Нават ужо ўнесяны аб гэтай справе запрос. Здаецца, што Сойм будзе дамагацца, каб Тымчасавая Урадуючая Камісія дала магчымасьць разгледжаньня ўсіх дакумэнтаў, датычачых гэтай справы. Гэтую справу канешна трэба скончыць, дзеля таго парушэньня, якое яна выклікала ва ўсім грамадзянстве.

— Судзячы па весткам з газэт, вы, пане Маршалак, мелі магчымасьць пазнаёміцца з цэлым радам выдатных асобаў у Віленшчыне; ці ня можна папрасіць Вас падзяліцца сваімі ўражэньнямі, а так сама, як асобныя групы, нацыянальныя ці палітычныя, глядзяць на справу Сойму і польска-літоўскіх адносін?

— Я думаю, ня трэба пану казаць аб паглядах польсьіх палітычных групаў, бо гэта ўсім ведама, а так сама і аб становішчы літоўскіх шовіністаў. Сярод беларусаў ,ёсьць дзьве групы: адна проціў польская а другая прыхільная да Польшчы. У кожным разе, найцікавейшае становішча жыдоў. Яны гавораць, што няўдзел іх у выбарах нельга лічыць за акт антыпольскі, што ў адносінах да Віленскага Сойму яны трымаюцца прыязнай нэйтральнасьці. Прынцыпова жыды стаяць на грунце стварэньня Вялікае Літвы, зьвязанае з Польшчай. Яны выбражаюць яе сабе, як дзяржаву, зложаную з трох комплексаў: літоўскага, польскага і беларускага. Граніцы гэтых комплексаў павінны адпавядаць вымаганьням этнаграфічным і гаспадарчым. У адносінах да Віленскага Сойму жыды выстаўляюць дамаганьне, што ён павінен адзначыць сваю міралюбівасьць у адносінах да іншых народнасьцяў. З гэтага відаць, што аўтаномія Віленшчыны прынцыпова ім адпавядае.

— Пане маршалак, якое ўражэньне вы вынясьлі з размовы з кс. біскупам Матулевічам.

— Кс. біскуп Матулэвіч у размове адзначыў, што ён увесь час стараўся быць далей ад палітыкі, маючы на відоку толькі дабро Касьцёла, што ў цяперашні момант ён ня бачыць, як з боку Літвы, так і Польшчы, таго пачатку, які могбы абедзьве стараны давясьці да мірнага ўзаемнага жыцьця.

Нарэшце я запытаўся, як хутка можна спадзявацца заканчэньня асноўных прац Сойму.

Пан Маршалак адказаў, што ў палове будучага тыдня (размова адбылася ў пятніцу 10-га лютага. Рэд.) асноўная формула, выражаючая волю насяленьня Віленшчыны, напэўна будзе вырашана.

(В. А. П.)

З Віленскага Сойму.

Суботняе паседжаньне Віленскага Сойму, на парадку дня якога было: 1) інтэрпэляцыі, 2) справаздача Мандатнай Камісіі, і 3) справаздача камісіі Палітычнай,—адчыніў Маршалак Сойму а гадзіне пятай пасьля полудня, пры поўнай салі, з вялікай цікаўнасьцю чакаючай вырашэньня пытаньня аб далейшай палітычна - дзяржаўнай будучыне нашага краю.

Ня меншую цікаўнасьць выклікае і інтэрпэляцыя ў справе апошніх арыштаў.

Пасля прачытаньня ўсіх інтэрпэляцыяў у ліку 14, паміж каторымі зьвяртае на сябе увагу інтэрпэляцыя Адраджэньня-Вызваленьня ў справе апошніх арыштаў. Маршалак заяўляе, што згодна з Соймавым Наказам, усе інтэрпэляцыі пойдуць да інтэрпэляцыйнай камісіі.

Сойм пераходзіць да другога пункту парадку дня, да справоздачы мандатнай камісіі. Ад імя камісіі выступае п. Энгэль, які даводзіць да ведама Сойму, што з паміж разгледжаных мандатаў, мандатная камісія прапануе 94 мандаты прызнаць правільным. Што датычыць мандатаў паслоў: Кіевіча, Адамовіча Яна і Бараноўскага, то правамочнасьць іх выбараў разглядае Касацыйная палата, дзеля пратэсту выбароў у адным з раёнаў восьмага выбарчага округу, якога Касацыйная Палата яшчэ не разглядзела. У такім самым стане знаходзіцца правамочнасьць выбараў Адамовіча Мацея, Людвіга Спэрскага, і Зыгмунта Гаспарауа. У адносінах да правамочносьці шасьцёх іншых дэлегатаў паступілі пратэсты бэзпасрэдна ў мандатную камісію і дзеля таго, што частку гэтых пратэстаў, унесшыя іх групы, хочуць спыніць, і дзеля таго, што мандатная камісія усіх гэных пратэстаў яшчэ не разглядзела. Камісія лічыць што на сягодняшнім паседжаньні разглядаць іх ня можна і просіць зацьвердзіць правамочнасьць 94 мандатаў. Прапазыцыя мандатнай камісіі соймам прымаецца.

Прадстаўнікам палітычнае камісіі з'яўляецца п. Фэдаровіч, які ў даволі доўгай прамове дае кароткі абрыс гісторыі Віленшчыны, прывёдшы яе да Віленскаго Сойму, заяўляючы ў пачатку свае прамовы, што ад імя большасьці камісіі можа запрапанаваць праэкт пастановы прыняты камісіі як аснова для дыскусіі. У праэкце гэным, пункты, якія ня выклікаюць прынцыповай рожніцы, прыняты у аднэй формуліроўцы. Пры чым прадстаўнікі розных групаў засьцярагліся, што будуць унасіць папраўкі, якія адцяняюць іх становішча. Праэкт гэны прынялі: групы згуртаваныя каля „Н. Д.", Рады Людовыя, Адраджэньне-Вызваленьне, П. С. Л., і Дэмакраты. Асобнае становішча займаюць група П. П. С. і група Адраджэньня, якія прад пленумам сойму абяцаліся унясьці свое прапазыцыі.

Прапанованы праэкт рэзалюцыі ўключае ў сабе вядомыя нам пункты аб парваньні усялякай сувязі з Расеяй, спыненьне якіх небудзь прэтэнсый да Віленскай зямлі—Ковенскай Літвы, няпрызнаньне якога—нібудзь вырашэньня Віленскага пытаньня бяз згоды яе жыцялёў, прызнаньне, што зямля Віленская стварае неразьдзельную частку Рэчпаспалітай Польскай, устаўадаўчыя улады каторай маюць выключнае права вырашыць справу будучага унутранага устройства Віленшчыны. У канцы рэзалюцыя кліча устаўадаўчы Польскі Сойм да бэзадкладнага выкананьня усіх правоў і абавязкаў зьвязаных з гэтай пастановай.

Пасьля прамовы п. Фэдаровіча. Выступае п. Хомінскі, які ад імя групы Адраджэньне-Вызваленьня заяўляе, што група гэто згадзілася на праэкт рэзалюцыі з агаворкай, што будзе ўнасіць ў яе папраўкі і ўнясе на пленум Сойму асобную пастанову аб аўтаноміі.

Пасьля п. Хамінскага выступіў п. Заштофт (П. П. С.) які ад імя свае партыі прапануе асобную пастанову, якая рожніцца ад пастановы большасьці камісіі тым, што ў ёй ясна выказана жаданьне аўтаноміі, а што датычыцца іншых пунктаў, то рожняцца яны ад праэкту большасьці палітычнай камісіі толькі сваей формуліроўкай.

У пекнай і добра сказанай прамове п. Заштофт выясьняе прычыны гэтага. Паказваючы паміж іншым, на тое, што у прапанованай праз П. П. С. пастанове яны ня лічаць магчымым зсылацца на гісторыю, правы якой, з'яўляюцца найчасьцей правамі сільнага. Гэта права пярэчыць сучаснаму паняцьцю аб дэмакратызме. Аснаўным момантам для яго з'яўляюцца воля народа і інтарэсы робочых і сялянства. Воля гэта і гэныя інтарэсы вымагаюць злучэньня з Польшай на асновах аўтаноміі.

Пасьля п. Заштофта мейсца яго займае п. Міцкевіч, прадстаўнік групы, якая стаіць на грунце фэдэрацыі. У прамове свaей, мала апрацаванай, п. Міцкевіч Сьцяпан з'вяртае увагу Сойму, што гэная пастанова кіруецца толькі голасам сэрца, што яна не глядзіць у будучыну, што яна адкідвае істнаваньне тых прычынаў, якія калісь прывялі да уніі Літвы з Польшчай, як роўнага з роўным.

Прычыны гэныя істнуюць і цяпераka і толькі яны павінны быць прыняты як аснова пры вырашэньні Віленскага пытаньня. Польскі народ павінен справу Віленшчыны вырашыць згодна з яго вялікімі традыцыямі.

Мову п. Міцкевіча ад часу да часу прарываюць воклічы з мейсцаў і калі п. Міцкевіч, пачынае адхіляцца ад сутнасьці пытаньня, п. Маршалак просіць яго гаварыць бліжэй да рэчы.

Ведаючы, што прапазыцыя Адраджэньня ня найдзе большасьці у Сойме, п. Міцкевіч ніякага рэальнага праэкту і не складае.

А гадзіне 7 з паловаю пасьля прамовы п. Міцкевіча, Маршалак пасяджаньне зачыняе.

Зямельная гаспадарка у Віленшчыне.

У „Gaz Krajowej" зьмешчаны артыкул п. Z. H. аб стане зямельнай гаспадаркі ў Віленшчыне.

Дзеля цікавасьці гэты артыкул скараціўшы перадрукоўваем:

Вынікам таго, што Віленшчына у працягу 7 гадоў была у ненармальных варунках, вызваных вайною, земляробства ў Віленшчыне панесло такія вялізарныя страты, пакрыць якія магчыма толькі маруднаю і стараннаю працаю ў працягу доўгага часу і толькі пры адпаведнай помачы ураду.

Наагул усе галіны зямельнай гаспадаркі у Віленшчыне, асабліва у прыфрантавой паласе, ўздоўж расейска-нямецкіх аконаў, ў параўнаньні са становішчам даваенным,—знаходзяцца у катастрофічным палажэньню, якое паважна пагражае эканамічнай раўнавазе краю.

Аднак, калі мы цяперашняе становішча паруўнаем з тым, якое было ў момант апошняга бальшавіцкага наезду, то перакананемся, што 1921 год пацьвярджае старую спасьцярогу, што, па моцных патрасеньнях і апусташэньнях гаспадаркі ідзе пэрыод узмоцненага парываньня да ўзнаўленьня згубленай раўнавагі.

Ня трэба забывацца яшчэ і таго, што земляробства знаходзіцца болей пэрыодзе адбудовы, чым нармальнага разьвіцьця, і дзеля гэтага мы не павінны рабіць смутных вывадаў, раўняючы цяперашняе становішча з даваенным.

Ход адбудовы зямельных гаспадарстваў паказвае на сталае павялічэньне лічэбнасьці за шчот гатунку, але гэтае зьявішча пройдзе тагды, калі зямельная гаспадарка выйдзе з пэрыоду адбудовы ў стан сталага нармальнага разьвіцьця.

Трэба адзначыць, што ў многіх выпадках неадпаведныя стораны ў разьвіцьці і адбудове земляробства, было-бы магчыма выключыць, прышоўшы тым ці іншым спосабам з дапамогаю.

Паводлуг урадовых даных у Сярэдняй Літве ў 1920/21 г. было засеяна збожжам і засаджана бульбаю толькі каля 65 працэнтаў таго зямельнага абшару, які абрабляўся ў даваенным часе, а трэцяя частка грунту ў апошнім годзе стаяла пусткай.

Абшары пасеву зьменшыліся, дзеля прчын агульных, выкліканых вайною, акупацыямі і бальшавіцкімі наездамі, а так сама і адсутнасьцю многіх уладароў земель, якія і дагэтуль застаюцца неабробленымі. Найбольшае апусташэньне зрабіла вайна ў прыфрантавой паласе, ўздоўж расейска нямецкіх аконаў, якія праходзілі на тэрыторыі Сярэдняе Літвы праз 12 гмін, з абшарам, самае малае, 2.000 квадратных кілёмэтраў (каля 200000 дзесяцін).

Усяго ў гэтай паласе зьнішчана 68 працэнтаў ўсіх зямельных гаспадарстваў.

На рэштцы абшару, прычыны зьменшаньня плошчы пасеву—даволі ўсім вядомы, гэта: недахват мёртвага інвэнтара і насеньня.

Па падлічэньню вынікае, што леташняга ураджаю, які сабралі ў Сярэдняй Літве, ня хопіць да новага.

Яшчэ болей зьменшылася лічэбнасьць жывога інвентара; напрыклад: быдла і каней зьменшылася па 50 працэнтаў.

Зьмяншэньне жывога інвэнтара адбылося галоўным чынам за кошт вялікшай ўласнасьці (маёнткаў), але шмат стратаў панясло і сялянскае гаспадарства.

Найболей зьменшылася лічба жывога інвэнтара ў прыфрантавой паласе, гдзе па агульнаму падліку на дзьве гаспадаркі выпадае па аднаму каню і па адной шт. быдла.

З ГАЗЭТ.

Чаму нас вучыць прошласьць? Вось на гэтае пытаньне дае „баявы" адказ пан І. О. ў Віленскай „Rzeczypospolitej".

„Прыхільнікі аўтаноміі, як у Вільні так і ў Варшаве, прывыклі высоўваць як галоўны мэтыў погляд на Ковенскую Літву, для якой аўтаномія Віленшчыны можа паслужыць мостам для будучага зьбліжэньня з Польшчаю.

І мы ня зьяўляемся прыхільнікамі паненьня за сабою мастоў, і мы ня знаходзімся на становішчы зусім непрымірымым—наадварот, верымо, так сама як паны з левых партыяў, што рана ці позна павінна дайсьці да паразуменьня з Літвой, толькі лічым, што тактыка нашых аўтанамістаў і фэдэралістаў, тактыка ўступак і працягваньня рук ў прастор, ёсьць тактыка абмылковая і замест пажаданай мэты аб'еднаньня, прыводзіць да яшчэ большага раздваеньня, ўзьвялічвае пропасьць, разьдзеляючую Польшчу ад Ковенскай Літвы, і ў дадатак даводзіць да утраты Віленшчыны. Clara pacta claros faciunt amicos—толькі рашучасьць з нашага боку можа раскрыць вочы кіруючым ковенскім сфэрам".

Каб даказаць правідловасьць свaей пазыцыі пан J. О. зьвяртаецца да гісторыі. Лоўка падтасоўваючы гістарычныя факты, ён даходзіць да перакананьня, щто ўзапраўды ніякай уніі (гэта значыцца — дабравольнага аб'еднаньня) ў Люблінe ў 1569 г. ня было, а тагачасная Польшча проста падгарнула пад сваё крыло літоўскія землі і змусіла літоўскіх магнатаў падпісаць належны акт, пакінуўшы ім за гэта на ўласнасьць неправна заграбленыя імі казённыя маёнткі...

Далейпан J. О. піша:

„Калі, адносячыся да варункоў цяперашняга моманту, замест Валыні і Падляшша возьмем Віленшчыну, ня меняй польскую і да Польшчы імкнучую, а замест тагачаснай літоўскай партыі-Ковенскі Урад і прыхільных яму нашых аўтанамістаў—атрымаем сытуацыю, зусім падобную да той, якая была 350 гадоў назад—а разам атрымаем ускazоўку, як належыць пастунаць, каб справу нашых усходніх крэсаў давясьці да добрага канца. Толькі рашучая, непалавінчатая палітыка чынy (курсыў аўтара. Рэд.) а ня слоў, можа развязаць гэты заблутаны вузел."

Вось да якіх вывадаў мог прыйсьці зьдзіяцнеўшы розум палітыка і гісторыка з газэты „Rzeczpospolitaj!"

Праваслаўная цэрква у Польшчы.

Як ведама, у канцы студня г. г. ў Варшаве адбыўся зьезд вышэйшага праваслаўнага духавенства. На гэтым зьездзе павінны былі быць вырашаны рожныя пытаньня аб узаемных адносінах праваслаўнай цэрквы ў Польшчы з Польскім Урадам. Але пажаданых вынікаў праца зьезду не дала, бо эпіскапы Навагрудзкі Пантэлеймон і Горадзенскі Уладзімір адмовіліся падпісаць прапанаваны прадстаўніком Міністэрства Асьветы і рэлігіі праэкт конкордату (умовы).

Гэтымі днямі будуць аб'яўлены Міністэрствам Асьветы і Рэлігіі тымчасовыя правіла аб адносінах праваслаўнай цэрквы ў Польшчы да Польскага Ураду.

Як паведамляе „Славбюро", эпіскап Пантэлеймон звольнены ад кіраўніцтва Навагрудзкаю эпархіяю і павінен будзе памесьціцца ў адным з манастыроў.

Навакола Сойму.

Пан Маршалак Сойму на некалькі дзён выежджае з Вілені у Ашмяншчыну. Падчас яго адсутнасьці замешчаць яго будзе старшы віцэ маршалак пан Баньkоўскі.

Унясеньне запросаў.

У Сойм унясены 16 запросаў, у тым ліку гэтакія:

1) Дэлегата Остроўскага і інш. („Рады Люд.) аб арэштах палякаў у Коўні; 2) Аб звальненьні з войска тых асоб, якія карыстаюць адсрочкай; 3) Клюба P. S. L. дэмакр. і „Адрод-Вызв. — прапазыцыя аб тым, каб Старшыня Час. Урадуючай Камісіі выдаваў дэкрэты па згодзе з Старшынёй Сойму; 4) Аб надзеле зямлёю дэмабілізованых непаходзячых 'з Сярэдняй Літвы; 5) Аб тым, каб прысьпяшыць з зямельнай рэформай; 6) Аб выданьні акту аб амністыі; 7) Аб арэштах у Вільні літоўцаў і беларусоў; 8) Аб безработніцы і інш.

Прывітаньне Папы.

Віленскі Сойм пастанавіў выслаць прывітальную тэлеграму Папе Пію XI ад імя Сойму.

ХРОНІКА.

Статыстыка выбараў.

Генэральны Выбарчы Камісарыят апрацоўвае абшырную статыстыку Віленскіх выбараў. У гэтай статыстыцы будуць прадстаўлены дакладныя рэзультаты выбараў з падзелам выбаршчыкаў паводле нацыянальнасьці і веку. Так сама будзе апрацована статыстыка выбаршчыкаў паводле прафэсыяў. Заданьнем гэтай стастыстыкі з'яўляцца зазнаёміць грамадзянства і заграніцу з прабегам Віленскіх выбараў.

Тэлеграма А. Мэйштовіча з прычыны выбару папы.

Старшыня Часовай Урадаючай Камісіі п. Мэйштовіч паслаў папскаму нунцыю у Варшаве Лоры прывітальную тэлеграму з прычыны выбара папаю Пія XI, у якой, між іншым, зазначвае, што Вільня з падзякаю ўспамінае нядалёкую мінуўшчыну, калі Яго Сьвяцейшаства адведаў гэты край, і быў прыняты з праўдзівым энтузыязмам. Тэлеграма заканчываецца просьбаю перадаць яе папе і просіць аб удзеленьні благаслаўленьня для тутэйшага насяленьня.

Высылка вагонаў.

Для патрэб Віленскага жалезнадарожнага вузла высланы з Варшавы новыя таварныя вагоны.

Фалшывыя грошы.

У апошнія дні на чорнай біржы з'явіліся фальшывыя залатыя 5 і 10 рублёвікі. Агенты чорнай біржы прадаюць фальшывыя грошы асобам, якія выяжджаюць з Вільні.

Рэдактар-Выдавец: Вацлаў Адамовіч. Друкарня „Друк" Субач 2.